# МАТЭРЫЯЛЫ СМІ



Дзянніца. – 2015. – №16. – 24 лютага. – С. 10



**Насустрач Дню беларускага пісьменства**

**Нядаўна ў Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэцы прымалі гасцей з Мінска – пісьменніцу Аксану Спрынчан і музыканта Яраша Малішэўскага, якія прыехалі прэзентаваць новую кнігу "Чытанка для маленькіх", што выйшла ў выдавецтве "Кнігазбор".**

# ПАДАРУНАК ДЛЯ ДЗЕТАК



"Чытанка для маленькіх" – гэта выдатны падарунак для тых, у каго падрастаюць дзеці. Кніга змяшчае вершы і казкі, калыханкі і гульнёвыя прыпеўкі для дзетак да трох гадоў. Творы ў чытанцы сабраны як народныя, так і аўтарскія.

Дзеткі могуць смела гартаць гэтую кніжку, бо яна ў цвёрдай вокладцы, а старонкі са шчыльнай паперы. А гартаць яе маленькія будуць з сапраўдным задавальненнем, будзьце ўпэўнены! Выданне аздоблена прыгожымі і яркімі малюнкамі мастачкі Святланы Каньковай-Дударэнка.

Вядучая прэзентацыі – пісьменніца Аксана Спрынчан – стала сапраўднай праважатай у чароўны свет чытанкі, пазнаёміла з яе героямі, падрыхтавала гульні і забаўлянкі для дзетак, што сабраліся ў бібліятэцы. Музыка Яраш Малішэўскі зачараваў усіх ігрой на незвычайных старадаўніх беларускіх музычных інструментах. Такіх, як дуда, пішчыкі, варган, гітара, шалястуны, акарына і іншых.

Мерапрыемства спадабалася не толькі дзецям, але і дарослым, якія на ім прысутнічалі. Вельмі прыемна, што нашых жалудоцкіх дзетак забаўлялі госці са сталіцы.

**Галіна БЕКІШ,**
**загадчыца Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэкі.**



**Падчас прэзентацыі "Чытанкі для маленькіх" у Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэцы**

вучнямі спецыяльнай адукацыі працуюць
дзесяць педагогаў-дэфектолагаў.
– Думаю, адзін з крытэрыяў ацэнкі
паспяховасці нашай навучальнай установы
– дасягненні выпускнікоў, – га-

га аграрнага універсітэта, ужо другі год за
пар атрымлівае Прэзідэнцкую стыпендыю.
У мінулым годзе вучні Галавічпольскай
школы занялі 82 прызавыя месцы ў розных
конкурсах, спаборніцтвах, у навукова-прак-
тычных канферэнцыях. Дзевяцікласнік Гер-
ман Сматрук, з якім займаецца Т.В. Скерсь,
стаў пераможцам міжна-

Сярод калег хочацца вылучыць настаўніцу
пачатковых класаў і малявання Т.В. Скерсь,
хіміі і біялогіі – Г.М. Шостак, настаўніцу гіс-
торыі Л.Л. Паўлюкевіч, беларускай мо-
вы і літаратуры Я.С. Астап. Поспехі гэтых
педагогаў відавочныя. Дарэчы, ужо сёлета
вучань педагога Г.М. Шостак – адзінаццацік-
ласнік Антон Скерсь – заняў трэцяе месца ў
абласной алімпіядзе па біялогіі. І гэта не пер-
шы яго высокі вынік.

ж пуўрымслівыя, цікаўныя першакласнікі.
– У абуладкаванне нашай школы
ўкладзены не толькі значныя сродкі, але
і часцінка душы кожнага педагога, – га-
ворыць Ж.А. Пашук. – Таму хочацца, каб
Галавічпольскі дз/с-СШ быў заўжды за-
патрабаваны. Нездарма наша гаспадар-
ка выдзяляе новыя дамы маладым сем'ям.
А калі нараджаюцца і растуць дзеткі, зна-
чыць, у школы ёсць будучыня.

**Ганна РУДСКАЯ.**
**Фота Аляксандра КАСПЕРЧУКА.**

**Да працы – з душой**

# Захавальніцы кніжнага скарбу

**Калі журналісцкія сцежкі прыводзяць у Жалу-
док, заўсёды завітваю ў бібліятэку. Нават калі ня-
ма інфармацыйнай нагоды. Проста хочацца пад-
сілкавацца добрымі эмоцыямі, пагутарыць з
мілымі, абаяльнымі бібліятэкаркамі. Атмасфе-
ра тут заўсёды цёплая, душэўная. Паліцы з кнігамі,
прыгожыя пакаёвыя кветкі, каларытныя паробкі –
усё гэта цудоўна спалучаецца ў інтэр'еры. Хочацца
ўзяць кнігу, уладкавацца ў крэсле і адправіцца ў ці-
кавае падарожжа з любімымі героямі...**

З задавальненнем наведваюць
Жалудоцкую гарпасялковую біб-
ліятэку і жыхары пасёлка, а так-
сама навакольных вёсак. Для
аматараў кніг бібліятэка стала
своеасаблівым інфармацыйным,
сацыяльна-асветніцкім і культур-
ным цэнтрам. Летась яе паслу-
гамі скарысталіся 2530 чытачоў,
а наведалі ажно 21400 чала-
век, кнігавыдача склала 39 тысяч
экзэмпляраў. Крыніцай інфарма-
цыі для наведвальнікаў з'яўля-
юцца не толькі 43,5 тысячы экзэм-
пляраў кніг, часопісаў і газет, але і
бязмежнае поле інтэрнэт-рэсур-
саў, дарэчы, 54 электронныя да-
кументы даволі запатрабаваныя

чытачамі. У мінулым годзе біблія-
тэчны фонд папоўніўся 2016 эк-
зэмплярамі, з якіх 1136 – кнігі.

Гаспадыні гэтага храма кнігі Галі-
на Мікалаеўна Бекіш, Святлана Ка-
зіміраўна Іода, Наталля Чаславаў-
на Семянюк, Марыя Іванаўна Круг-
лая стараюцца, каб наведвальні-
кам было ўтульна і камфортна, каб
кожны знайшоў "сваю" кнігу, атры-
маў дакладны адказ на хвалюючае
пытанне, скарыстаўся інфармацы-
яй з першакрыніц.

– Мы выкарыстоўваем розныя
формы і метады работы з чытачамі,
– расказвае загадчыца бібліятэкі
Галіна Мікалаеўна Бекіш. – Летась
толькі для нашых юных чытачоў


Творчы калектыў Жалудоцкай бібліятэкі

падрыхтавалі 57 цікавых і пазна-
вальных мерапрыемстваў. Гэта аг-
ляды літаратуры, гадзіны здароўя,
відэалекторыі, літаратурныя кру-
ізы, экалагічныя прагулкі і іншыя.
Мае калежанкі – людзі творчыя,
ініцыятыўныя, працуюць з душой.
Мы цесна супрацоўнічаем з інфар-
мацыйным цэнтрам па ўстойлівым
развіцці і экатурызме, Жалудоцкім
Домам культуры, мясцовай шко-

лай. Значную дапамогу пры пра-
вядзенні мерапрыемстваў аказвае
нам сельвыканкам.

Пацвярджаючы сказанае, загад-
чыца паказала маляўнічыя альбо-
мы, дзе на здымках захаваліся са-
мыя яркія моманты цікавых веча-
рын і імпрэз.

Работнікі бібліятэкі не пакідаюць
без кніг пажылых і адзінокіх люд-
зей, інвалідаў, якія жывуць у вёс-

ках. Наведва-
юць іх, прыносяць кнігі, выкон-
ваюць даручэнні вяскоўцаў, а
абслугоўваць даводзіцца жыха-
роў 14 населеных пунктаў. Біблія-
тэкаркі – частыя госці і ў аддзялен-
ні сястрынскага догляду мясцовай
бальніцы.

У Жалудоцкай гарпасялковай
бібліятэцы аказваюць 41 від плат-
ных паслуг, летась тут зарабілі
больш як 9 млн. рублёў. Карыстан-
не інтэрнэтам, ксеракапіраванне,
раздрукоўка тэкстаў, доступ да
прававой інфармацыі – найбольш
запатрабаваныя паслугі.

Біяграфія Жалудоцкай гарпасял-
ковай бібліятэкі пачалася ў 1951
годзе. Колькасць яе чытачоў можа
прыраўняцца да насельніцтва не
самага малога горада. Адметна,
што былыя чытачы, што жывуць у
далёкіх гарадах, як толькі прыяз-
джаюць на малую радзіму, абавяз-
кова наведваюцца ў бібліятэку.
Вось і цяперашні масквіч І.С. Мар-
чук стаў добрым сябрам бібліятэ-
кі. А ў адзін з прыездаў ён зрабіў
сюрпрыз сваім юным землякам –
падарыў бібліятэцы шматтомную
ілюстраваную энцыклапедыю для
дзяцей. Кніга звязвае пакаленні, і
гэта неаспрэчны факт.

**Ала УЛАДЗІМІРАВА.**

Да работы – з душой

# Там, дзе цвітуць "Незабудкі"

***У наш час любую інфармацыю, любы твор можна знайсці ў інтэрнэце. І ўсё ж чытаць кнігу, трымаючы яе ў руках, перагортваючы старонкі, мяркую, значна прыемней. Ад кнігі ідзе добрая энергія, адчуваеш утульнасць і спакой.***

Такую добрую аўру адчуваюць і чытачы Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэкі. Для 2450 аматараў кніг, сярод якіх 850 хлопчыкаў і дзяўчынак, бібліятэка стала цэнтрам інфармацыі, культуры і вольнага часу. Тут працуюць мілыя, абаяльныя жанчыны, якія стараюцца, каб наведвальнікам бібліятэкі было ўтульна і камфортна, каб кожны знайшоў "сваю" кнігу.

Загадчыца бібліятэкі Галіна Мікалаеўна Бекіш з цеплынёй расказала пра іх невялікі дружны калектыў.

– Паўтара года таму ў памяшканні зрабілі рамонт, – зазначыла Галіна Мікалаеўна. – А нашы дзяўчаты аздобілі інтэр'ер кветкамі, паробкамі.

Сапраўды, прыгожа атрымалася. Адчуваецца, што людзі тут творчыя, неабыякавыя, працуюць з душой. Фонд бібліятэкі складае 43 тысячы экземпляраў. Кожная кніга займае сваё пачэснае месца на паліцы. Увагу прыцягваюць тэматычныя выставы. Такія, як "Веліч роднай зямлі", "Сферы жыцця рэгіёна", "Гартаючы старонкі часопісаў" і іншыя. Бібліятэкары не пакідаюць без кніг пажылых людзей, інвалідаў, якія жывуць у вёсках. Наведваюць іх, прыносяць кнігі, выконваюць даручэнні вяскоўцаў.


С.К. Іода, М.І. Круглая і Г.М. Бекіш з падарунка земляка зрабілі выставу

Бібліятэкары трымаюць цесную сувязь са школай і Домам культуры. Разам рыхтуюць розныя мерапрыемствы. Марыя Іванаўна Круглая паказала фотаальбомы, дзе занатаваны самыя яркія моманты цікавых сустрэч.

– Да нас часта прыходзяць былыя работнікі бібліятэкі А.Р. Сярко і А.В. Куцкель, яны душой з намі, – падкрэсліла Марыя Іванаўна.

М.І. Круглая раней працавала бібліятэкарам у в. Баяры Жалудоцкія, а як скасавалі бібліятэку, уладкавалася ў гарпасялковую. Тут ёй вельмі падабаецца працаваць, калектыў, як дружная сям'я.

У памяшканні бібліятэкі шмат прыгожых вазонаў на вокнах, на паліцах, ёсць нават зялёны куточак, дзе сабраны вельмі арыгінальныя расліны. Аказваецца, на базе бібліятэкі працуе аматарскае аб'яднанне "Незабудкі". Тут згуртаваліся кветкаводы-аматары, якія на сваіх пасяджэннях абменьваюцца вопытам, дзеляцца насеннем, выпісваюць яго, разводзяць рэдкія сарты кветак. Жалудоцкія кветкаводы неаднаразова ўдзельнічалі ў свяце кветак, іх кампазіцыі атрымалі высокую ацэнку сапраўдных знатакоў.

У бібліятэцы працуе цэнтр прававой інфармацыі, да паслуг наведвальнікаў – інтэрнэт, ксеракс.

Бібліятэкары натхнёна расказвалі пра сваю работу і вельмі шкадавалі, што адсутнічае іх калега Наталля Чаславаўна Семянюк. Яна якраз была на сесіі. Жанчыны з гонарам зазначылі, што ў бібліятэку завітваюць не толькі жыхары пасёлка. Напрыклад, іх зямляк Іван Станіслававіч Марчук, які цяпер жыве ў Маскве, стаў добрым сябрам бібліятэкі і шчодрым спонсарам. Ён падарыў бібліятэцы энцыклапедыю для дзяцей – 52 кнігі. Святлана Казіміраўна Іода, якая абслугоўвае юных чытачоў, падкрэсліла, што яны вельмі задаволены такім падарункам. Гартаючы маляўнічае, добра ілюстраванае выданне, хлопчыкі і дзяўчынкі атрымліваюць адказы на любыя пытанні.

Цікавыя кнігі і прыгожыя кветкі – гэта тое, што заўсёды радуе наведвальнікаў Жалудоцкай гарпасялковай бібліятэкі, як і добрыя ўсмешкі яе работніц.

**Ала УЛАДЗІМІРАВА.**
**Фота Аляксея БІБІКАВА.**




**Паважаныя нашы жанчыны!**
Ад усяго сэрца віншуем вас з цудоўным вясеннім святам – 8 Сакавіка!

*Милые женщины, добрые, верные!*
*С новой весной вас, с каплями первыми!*
*Мирного неба вам, солнца лучистого,*
*Счастья заветного, самого чистого!*
*Много вам ласки, тепла, доброты,*
*Пусть исполняются ваши мечты!*

**Дырэкцыя і прафкам РУСП "Саўгас "Вялікае Мажэйкава".**

**Из редакционной почты**

# Слово о библиотекарях

Uберегая тишину,
Здесь говор громкий неприемлем.
Сюда приходят, как в страну,
Где волшебство извечно дремлет.
Где глаз совиный* стережет
Хранилищ тайные покои,
И время свой отсчет ведет,
Ничем земным не беспокоя.
У книжных полок персонал
Напоминает фей-искусниц:
Вас проведут в читальный зал,
Домой без книжек не отпустят.

*Прим. Глаз совиный – Департамент охраны носит эмблему ночной совы.*



**Мы с мужем являемся постоянными читателями Желудокской горпоселковой библиотеки. Я, например, люблю читать романы Знаменской, Донцовой, Шиловой, Батраковой и других авторов. Муж увлекается военными книгами и детективами, интересуется новостями из журнала "Планета". Сотрудники библиотеки всегда предложат книгу по душе, порекомендуют почитать интересную новинку. Хочется поблагодарить этих замечательных женщин за преданность своему делу и рассказать о них.**

Мария Ивановна Круглая всегда с улыбкой встречает своих читателей. Библиотечному делу она отдала 28 лет. Сначала работала в Боярах Желудокских, а в 2009 году пришла в коллектив Желудокской горпоселковой библиотеки, который стал родным для неё.

Почти два десятка лет работает в библиотеке Светлана Казимировна Иода, она обслуживает маленьких читателей, а их около трёхсот. Очень вежливая, внимательная и уважительная ко всем – как ко взрослым, так и к детям. Светлана Казимировна хорошо знает детскую и школьную литературу, может легко найти и порекомендовать ее юным книголюбам. А какие интересные мероприятия проводит для школьников! Она тесно сотрудничает с учителями местной школы. Библиотекарь с теплотой говорит о своих наставниках – Александре Григорьевне Серко, Леокадии Васильевне Куцкель, которые научили ее библиотечному делу.

Наталья Чеславовна Семенюк – библиотекарь читального зала. Стаж её работы – восемь лет, заочно окончила Гродненский колледж искусств. Живая, энергичная, она легко находит общий язык с читателями, умеет предложить нужную литературу.

Тёплые слова хочется сказать в адрес заведующей библиотекой Галины Николаевны Бекиш. Она гордится своим коллективом, поддерживает инициативу каждого работника. Не случайно в библиотеке очень уютно, все сделано и подобрано с любовью, много комнатных растений. Галина Николаевна и сама является цветоводом-любителем, ее дом с ранней весны и до поздней осени утопает в цветах.

За чистотой и порядком в залах библиотеки и за прекрасными растениями следит Надежда Андреевна Гущина, она относится к работе добросовестно и с душой.

У коллектива много наград за хорошую работу. Желудокские библиотекари успешно выполняют план по всем показателям. Обслуживают и жителей ближайших деревень. С прошлого года в библиотеке работает игровая комната "Смешарики", где много детских книг, игрушек, конструкторов. Здесь можно на некоторое время оставить детей под присмотром библиотекаря. А также в игровой комнате празднуются детские именины. Есть и уголок детского творчества, где представлены рисунки, вышивки и рукоделие юных желудчан.

У всех моих героинь прекрасные семьи, они воспитали хороших детей. От всей души хочу поздравить милых сотрудниц с Днём библиотек. Желаю всем крепкого здоровья, семейного благополучия, добра и мира!

**Мария РУДАЯ,**
**жительница г.п. Желудок.**

**Из редакционной почты**

# Праздник в кругу друзей



**Хочу рассказать о празднике, посвященном Дню матери, который организовали работники Желудокской библиотеки и Желудокского Дома культуры. Они пригласили своих бывших коллег, а также местных мастеров-рукодельниц, цветоводов-любителей и читателей.**

Очень красиво и душевно вели программу Галина Николаевна Бекиш и Валентина Вацлавовна Климович. Расстрогала до слёз песня "Мама" в исполнении Дмитрия Поварго. Весёлыми, задорными и грустными мелодиями очаровал ансамбль "Сябрына". Прозвучали всеми любимые песни "Ах, судьба", Малиновка, "Деревенька" и многие другие. Вместе с талантливыми артистами пели все присутствующие. В программе праздника были и разнообразные игры.

За чаепитием хорошие стихи о маме прочитала Тамара Павловна Будревич, бывшая учительница. Теплые слова о самом дорогом человеке прозвучали из уст учительницы и солистки ансамбля "Сябрына" Наталии Владимировны Каптур, а также гостьи праздника Александры Григорьевны Серко. А руководитель церковного хора Глафира Владимировна Цыбрук отметила, что День матери совпал с большим православным праздником Покров Пресвятой Богородицы. Царила душевная атмосфера: все желали высказаться и всем было очень хорошо. И немножко грустно, когда говорилось и пелось о маме.

От всей души хочется поблагодарить всех работников библиотеки и Дома культуры за такой замечательный праздник.

**Мария РУДАЯ,**
**жительница г.п. Желудок.**

Дзянніца. – 2015. – 31 кастр. – с. 8

# Путь в Щучин лежит через... Желудок





■ Памятник желудям.

## Как охота князя дала название удивительному месту, где находят древние монеты и почему теперь этот поселок можно назвать музеем под открытым небом

**НЕСВЕДУЩИЙ заезжий гость название этого населенного пункта Щучинского района произнесет или прочтет только так — ЖелУдок. Не потому ли, подумает он, что здешние места славятся своими кулинарами или несколько столетий назад у проезжавшего мимо этого местечка знатного барина прихватило живот, а местные знахарки его вылечили? Ничего подобного. На самом деле, научили меня местные жители при встрече, правильно ударение ставить на последний слог — ЖелудОк. То есть в «честь» желудей, и никак иначе. Что, впрочем, не отменяет оригинальные вековые истории, которые таят в себе эти удивительные места.**

### На огороде – римские монеты

Такой занимательной или замечательной историей, как у Желудка, едва ли

Таисия Владимировна продолжает:

— Дворец выстоял в годы революций и двух войн, но сейчас он в плачевном состоянии — нужна реставра-





рать свадьбу или отпраздновать юбилей. И не только местные жители здесь праздники отмечают, а со всего Щучинского района, да и соседнего Лидского приезжают».

### Свой фестиваль цветов

Живут ли в поселке мастера или мастерицы, охочие до народного творчества? Меня направляют к вышивальщице Елене Сметюх.

— Вышивать меня учили мама, бабушка, а теперь я и сама по книгам изучаю новые технологии. Рукоделие всякое люблю — и аппликации делаю, и вяжу, и плету. Вот посмотрите, сколько работ уже начато.

У Елены Михайловны их сотни, и все сделаны своими

...чайных сітуацыях; ваеннаслужачыя расійскіх узброеных сіл.

**БелТА.**

**По закліку сэрца**

# "Пераможца" – для пераможцы

**Напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі на падворку ветэрана Вялікай Айчыннай вайны і працы з г.п. Жалудок Іосіфа Іосіфавіча Смецюха з'явілася сем яблыняў. Іх падарыў паважанаму чалавеку былы старшыня Шчучынскага раённага Савета дэпутатаў, роданачальнік свята кветак на Шчучыншчыне Аляксандр Пятровіч Васько. Разам са старшынёй Жалудокскага пасялковага выканаўчага камітэта Генадзем Іванавічам Цывінскім яны высадзілі саджанцы і пажадалі ветэрану шмат шчаслівых вёснаў.**



У гасцях у ветэрана І.І. Смецюха А.П. Васько і Г.І. Цывінскі

– Пайшоўшы на пенсію ў 2010-м, я не сяджу без справы: займаюся садаводствам, кветкаводствам, маю ўласны гадавальнік, – расказвае Аляксандр Пятровіч Васько. – Вельмі шаную свята Вялікай Перамогі і ветэранаў мінулай вайны, таму вырашыў у знак удзячнасці да іх неўміручага подзвігу правесці ўласную акцыю…

"Дэсант" высадзіўся акурат на Першамайскай вуліцы гарадскога пасёлка Жалудок. Пакуль госці высаджвалі яблынькі, 89-гадовы Іосіф Іосіфавіч расказваў пра вайну і свой лёс.

У армію яго прызвалі ў 1944-м. У саставе Войска Польскага прайшоў ад Беластока да Берліна, удзельнічаў у вызваленні Варшавы, Познані і іншых польскіх гарадоў ад фашыстаў, фарсіраваў Одэр, вызваляў Чэхаславакію. Быў вадзіцелем "палутаркі". Вазіў на перадавую артылерыйскія снарады, узбраенне, паліва для танкаў і іншай ваеннай тэхнікі, забяспечваў усім неабходным наступаючыя часці 2-ой арміі 2-га Беларускага фронту. Мае дзяржаўныя ўзнагароды Рэспублікі Польшча, ордэн Вялікай Айчыннай вайны, медалі "За адвагу", "За перамогу над Германіяй".

Пасля вайны дапамагаў арганізоўваць мясцовы калгас, быў рахункаводам. Але большую частку працоўнага жыцця – амаль 36 гадоў – працаваў вадзіцелем у пажарнай часці, ратаваў ад агню маёмасць жыхароў і гаспадарак раёна. За гэта ўзнагароджаны ганаровым знакам "Выдатнік пажарнай аховы".

Як належыць сапраўднаму мужчыну, ажаніўся, пабудаваў уласную хату, разам з жонкай выхаваў сына і дачку, прычакаў унукаў і праўнучку. На жаль, шэсць год таму не стала любай Мар'яны, з якой разам дзяліў шчаслівыя 54 гады. Але дзеці не забываюць, не даюць сумаваць, ды і сацыяльны работнік Эмілія Гурэцкая заўсёды побач…

– Я жадаю, каб яшчэ шмат вёснаў Вы сустракалі ў добрым здароўі, мелі магчымасць любавацца квітнеючымі яблынямі і абавязкова паспыталі радасць ад смаку яблыкаў сорту "Пераможца", – пажадаў на развітанне Аляксандр Пятровіч Васько.

Іосіф Іосіфавіч шчыра ўсміхнуўся, падзякаваў за павагу, памахаў нам рукой і пайшоў гаспадарскім вокам аглядаць свой новы садочак…

**Ала БІБІКАВА.**

**Фота аўтара.**

**Виктор КУЦ**

## *Память*

*У обелиска – тишина.*
*Горит звезда, как только что отлита.*
*За горизонт ушла война,*
*Оставив память*
*в именах на плитах.*
*А сколько их,*
*шагнувших вдаль,*
*В дымившихся*
*покоятся воронках?*
*Какой взять шрифт,*
*чтобы печаль*
*Не жгла строку*
*солдатской похоронкой?*
*Сравняла непогода рвы*
*И линии траншей,*
*политых кровью.*
*Все: правые и те,*
*что не правы,*
*Сырой землёй*
*обласканы с любовью.*
*Холодный мрамор вновь согрет*
*Кроваво-красным*
*пламенем гвоздики.*
*А над курганом – тихий свет:*
*Победа спит здесь*
*воином великим.*
*Замру, когда, чеканя шаг,*
*Пройдут на смену*
*караулы мимо.*
*И стих свой приспущу,*
*как флаг,*
*У Вечного огня*
*страны любимой.*

Дзянніца. - 2013. - №35 - 9 мая.

Лёсы людскія

# Партызанская сувязная

8 мая Софія Сяргееўна Суйкоўская – жыхарка Жалудка, адзначыла свой 90-гадовы юбілей


Софія Сяргееўна часта разглядае сямейныя альбомы

*– Вайна ў імгненне вока разбурыла ўсё наша зладжанае спакойнае жыццё, – успамінае Софія Сяргееўна. – Як цяпер помню той чэрвеньскі дзень. У школе якраз ладзіўся выпускны вечар. Мы планавалі, марылі, спадзяваліся… Толькі падрыхтаваныя для паступлення дакументы так і не дачакаліся адпраўкі.*

***У той вечар я была дзяжурнаю. Зазваніў тэлефон. Чалавек на другім канцы проваду сказаў мне, што пачалася вайна, і папрасіў паклікаць дырэктара школы. Я ціхенечка ўзяла ў гардэробе сваю сумачку і, не заходзячы ў залу, пайшла дамоў. А там ужо ўсе ведалі. Нават чуваць было моцныя разрывы снарадаў… На Віцебшчыне, як і на тэрыторыі ўсёй нашай шматпакутнай краіны, пачаліся страшныя дні…***

### Сувязная Арляня

– З першых дзён вайны ўся наша сям'я дапамагала партызанам, – працягвае свой расказ Софія Сяргееўна. – Я дзейнічала пад канспіратыўнай мянушкай Арляня. Калі немцы вялі на расстрэл тых, хто быў звязаны з народнымі мсціўцамі, мяне выратавала толькі адно: шукалі хлопца-Арляня, а зусім

магілу нейкага важнага забітага немца. Там забраць стары букет, а свой пакласці. А заадно знайсці невялічкі скрутак. Я ўсё зрабіла, як было сказана. Скрутак знайшла, толькі куды яго пакласці, калі немцы правяраюць кожнага з усіх бакоў? Доўга раздумваць не было часу. Разглядзела сваю знаходку, зразумела, што не намокне, і … запіхала ў рот. І

было. Выдалі нам чаравікі, якія насілі ў старой арміі, анучы. На спіне заўсёды з сабою кацялок і лыжка. Спачатку разбіралі руіны вакзала. У кожнага была свая норма. Працаваць было цяжка, але яшчэ цяжэй было вытрымаць, пастаянна чуючы стогны, плач, і бачыць пакалечаных вайною людзей.

Разам з намі майстрам працаваў адзін дзя-

было мала. Да маразоў босымі бегалі. Дырэктар тэхнікума дамовіўся, каб мясцовыя гаспадары нас узялі на работу – капаць бульбу. Так і зараблялі, каб было што есці. Давалі стыпендыі нам 50 рублёў, толькі што яны значылі, калі буханка хлеба ў той час каштавала 20 рублёў. Ратаваў паёк і сахарын. Яшчэ варылі чарпак бульбы. Крыху пазней сталі даваць яду, якая прыходзіла з гуманітарнай дапамогай. Ніякія нястачы не былі для нас перашкодаю ў дасягненні пастаўленай мэты – вучыцца, набірацца вопыту, каб стаць добрымі спецыялістамі і прыносіць карысць Радзіме. У адну змену выкладчыкі нам тлумачылі тэму, у другую – мы пісалі канспекты. Так год і праляцеў, а потым паехалі працаваць па размеркаванні.

### У працоўнай кніжцы – толькі адзін запіс

– Мяне накіравалі ў Жалудоцкі раён бухгалтарам у райспажыўсаюз, – тлумачыць Софія Сяргееўна. – Так да пенсіі і працавала на адным месцы – 43 гады стажу. Там і з мужам сваім пазнаёмілася: ён быў старшынёй райспажыўсаюза.

Софія Сяргееўна – ветэран працы, выдатнік спажыўкаапераціі. Разам з мужам Юрыем Казіміравічам выгадавалі траіх дзяцей. Юрый Казіміравіч у гады вайны пайшоў дабравольцам на фронт, ваяваў у складзе

К

не дзяўчыну. І сёння помню ўсе свае заданні.

Першы раз мне належала быццам бы занесці шаўцу боты для рамонту. Уручылі мне пропуск, і пайшла я на заданне. Шавец боты адрамантаваў і сказаў мне іх абуць. Так у тых ботах я і накіравалася дамоў. На дарозе мяне спыніў незнаёмы мужчына, папрасіў зняць абутак, адарваў абцас і нешта забраў адтуль. Так я некалькі разоў «рамантавала» тыя боты, і такім чынам дастаўляла партызанам патрэбную інфармацыю.

А аднойчы мне неабходна было забраць штосьці важнае на могілках і перадаць партызанам. Для гэтага быў распрацаваны цэлы план дзеянняў. У двары адной з хат у вёсцы Свяча мяне чакала… цяля, якое трэба было завесці на палянку і там навязаць, а самой назбіраць цэлае бярэмя кветак і занесці іх на

не дарэмна. На выхадзе мяне спынілі немцы; абшукалі, толькі нічога не знайшлі.

У нашай мясцовасці дзейнічалі два партызанскія атрады: Аляксееўскі і Раманаўскі. Хто чым мог, дапамагалі ім. А ў камендатуры працавала перакладчыцай настаўніца нямецкай мовы, якая выратавала не адно чалавечае жыццё.

## На аднаўленні чыгункі

Пасля вызвалення Віцебшчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў усіх, хто быў маладзейшы, накіравалі працаваць на аднаўленні чыгункі ў Віцебску.

– Ад усёй чыгункі застаўся толькі адзін шлях, і той быў моцна разбураны, – расказвае Софія Сяргееўна. – Па гэтых рэйках на фронт везлі ўзбраенне, а з фронту – раненых. Мы капалі, разгружалі шпалы і рэйкі. Жылі ў паўразбураным будынку. Вады не

док. Ён і параіў ісці вучыцца, а спецыяльнасць шукаць такую, каб можна было хутка працаўладкавацца і пайсці на свой хлеб. Да вайны я марыла атрымаць прафесію стаматолага. Але ж усе мае планы рухнулі. У Віцебскі інстытут мяне бралі без экзаменаў на матэматычны факультэт. Толькі я не пайшла. Сястра знайшла аб'яву, што ў Гродне пры тэхнікуме адчыняецца гандлёва-кааператыўны факультэт. І вучыцца там толькі год.

## Вучыліся, нягледзячы на цяжкасці

– Забрала я дакументы з Віцебскага інстытута і паслала іх у Гродна, – працягвае свой расказ Софія Сяргееўна. – Мне прыйшоў адказ: прыязджайце. Дабралася 8 верасня, толькі заняткі яшчэ не пачыналіся. 18 чалавек жылі ў адным пакоі. Вельмі цяжка было: босыя, галодныя, адзення

процітанкавых войск 2-га Украінскага фронту. Дайшоў да Венгрыі і Румыніі.

Цяпер, ужо больш за дваццаць год, Софія Сяргееўна жыве адна.

Адна дачка і сын пасяліліся ў Санкт-Пецярбургу. Любоў Юр'еўна закончыла інстытут культуры, а цяпер на заслужаным адпачынку. Сын Сяргей Юр'евіч – кардыёлаг-рэаніматолаг, у свой час працаваў на Байкануры. А яшчэ адна дачка Святлана Юр'еўна жыве за мяжой. Дзеці часта наведваюцца да матулі, не пакідаюць яе надоўга адну. А яна заўсёды з нецярпеннем чакае іх.

У свае дзевяноста Софія Сяргееўна выглядае выдатна! Быццам і не было тых цяжкіх выпрабаванняў, якія ў свой час паслаў ёй лёс. Доўгіх год Вам, паважаная юбілярка! І моцнага здароўя.

**Ганна РУДСКАЯ.**

Насустрач 70-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў

# ЖЫЎ АДВАЖНЫ КАПІТАН...



**Сёння – дзень нараджэння славутага лётчыка, героя Савецкага Саюза П.М. Батырава, які гераічна загінуў у небе над Шчучыншчынай, змагаючыся з нямецка-фашысцкімі захопнікамі**

**Імя лётчыка Пятра Міхайлавіча Батырава для жыхароў нашага раёна асацыіруецца з мужнасцю і адвагай, а яго жыццёвы шлях з'яўляецца прыкладам любві і адданасці Радзіме.**

Нарадзіўся Пётр Батыраў 1 сакавіка 1918 года ў вёсцы Чулпанава Падольскага раёна Маскоўскай вобласці ў звычайнай сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сярэдняй школы паступіў у фабрычна-заводскае вучылішча Падольскага механічнага завода. Працаваў токарам. З захапленнем займаўся ў драмгуртку пры заводскім клубе, а таксама ў мясцовым аэраклубе. У апошнім ён так выдатна зарэкамендаваў сябе, што ў 1938 годзе яго разам з некалькімі найбольш здольнымі таварышамі накіравалі ў Тамбоўскае вышэйшае ваеннае авіяцыйнае вучылішча. Гэта і вызначыла далейшы лёс юнака.

Пётр цвёрда вырашыў стаць лётчыкам-знішчальнікам. Пасля заканчэння вучылішча папрасіў накіраваць яго ў раён бая-

Пасля заканчэння вайны з Фінляндыяй лётчык П. Батыраў быў пераведзены з павышэннем па службе ў адзін з авіяцыйных палкоў, які абараняў межы Савецкага Саюза на поўдні.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, Пётр Батыраў разам са сваімі таварышамі па палку апынуўся на перадавой: вёў барацьбу з фашысцкімі сцярвятнікамі, якія з'яўляліся ў небе над Каўказам.

Цяжкім для нашых войск быў люты 1942 года. Гітлераўскія полчышчы рваліся ў Крым, блакіруючы з сушы і паветра часткі Савецкай Арміі, якія мужна абаранялі Севастопаль. У гэтых баях лётчык П. Батыраў паказаў сябе храбрым воінам, гатовым аддаць жыццё ў барацьбе з акупантамі. Хутка ён стаў адным з лепшых "крылатых" разведчыкаў у палку.

163-га Гвардзейскага авіяпалка гвардыі капітаны Сямён Харламаў і Пётр Батыраў вылецелі ў чарговую разведку. Савецкае камандаванне надавала гэтай аперацыі вялікае значэнне. Разведчыкі лятаі над Керчынскім пралівам і фатаграфавалі шырокую палоску прыбярэжных вод і сушы. Спачатку трымаліся разам, а потым разляцеліся і працягвалі працаваць самастойна. Пётр Батыраў вёў самалёт і ўважліва аглядваў зямлю. З вышыні птушынага палёту яна здавалася роўнай і нічым не пры-



Герой Савецкага Саюза П.М. Батыраў

вы лётчык працягваў вылятаць на штурм і разведку варожых пазіцый, вёў барацьбу з фашысцкімі знішчальнікамі. Хутка гвардыі капітан П. Батыраў быў удастоены другога ордэна Чырвонага Сцяга.

Летам 1944 года лётчыкі авіяцыйнага палка, дзе служыў герой, сталі праводзіць баявыя аперацыі над тэрыторыяй Беларусі. Аднойчы Пётр Батыраў разам з таварышамі выляцеў насустрач вялікай групе варожых бамбардзіроўшчыкаў і знішчальнікаў, якія ішлі на штурм савецкіх пазіцый. Завязаўся паветраны бой, з якога пілот жывым не вярнуўся.

Існуе і альтэрнатыўная версія гібелі П. Батырава, згодна з якой ён разбіўся на эксперыментальным самалёце падчас вяртання ў тыл. Пахаваны лётчык у г.п. Жалудок. Імя героя носіць адна з вуліц пасёлка. Акрамя таго, у Жалудоцкай сярэдняй школе працуе музей, адна з экспазіцый якога прысвечана Пятру Міхайлавічу Батыраву. Значыць,

### Гістарычная даведка

**На рахунку гвардыі капітана П.М. Батырава 330 баявых вылетаў, з якіх 18 – штурмавых і 212 – разведвальных. Удзельнічаў у 52 паветраных баях, асабіста збіў 5 самалётаў і адзін – у групе. 30 верасня 1944 года загінуў пры выкананні баявога задання. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Чырво-**



роя Савецкага Саюза.



П.М. Батыраў (першы справа ў другім радзе) з аднапалчанамі

вых дзеянняў з фінамі, і ў першых жа баявых аперацыях праявіў адвагу, мужнасць і высокае майстэрства ў тактыцы вядзення паветранага бою. Менавіта ў гэты перыяд у Батырава раскрыўся талент лётчыка-разведчыка – назіральнага і стрыманага, які з лёгкасцю запамінаў схемы размяшчэння варожай абароны.

Дарэчы, Пётр Батыраў не толькі паспяхова праводзіў разведвальныя аперацыі, але і ўдзельнічаў у паветраных баях, падчас якіх збіў некалькі фашысцкіх самалётаў. Хутка адважны лётчык быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны 2-ой ступені.

2 студзеня 1944 года лётчыкі

метнай. Аднак у рвах і акопах знаходзіліся замаскіраваныя танкі, гарматы, мінамёты. Праз некаторы час у паветры з'явіліся "шапкі" ад разрыву зенітных снарадаў, і адважны лётчык нырнуў у густыя аблокі. Затым звязаўся па рацыі з напарнікам, і злучэнне разведчыкаў зноў пачало "прачэсваць" вызначаны раён. Тры дні кружылі лётчыкі над ворагам і вялі фотаздымку, падрабязна фіксавалі нямецкія ўмацаванні і агнявыя кропкі. Заданне было паспяхова выканана, і праз некалькі дзён паводле даных авіяразведкі нашы войскі высадзілі дэсант.

1 ліпеня 1944 года Пётр Батыраў правёў разведку на рацэ Бярэзіне і выявіў месцазнаходжанне дзеючых перапраў, а таксама 2000 аўтамашын, 30 танкаў, 58 гармат, да 1500 абозаў праціўніка, яго пяхоту. Падчас гэтай аперацыі быў сур'ёзна пашкоджаны рухавік самалёта, аднак лётчык паспяхова "дацягнуў" да аэрадрома і далажыў звесткі камандаванню.

За мужнасць і адвагу, за дакладныя разведданыя Пётр Міхайлавіч Батыраў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга і назначаны намеснікам камандзіра палка.

Нягледзячы на занятасць на новай пасадзе, 26-гадо-

каў, а яго слаўныя подзвігі ніколі не будуць забыты.

**Аляксандр КАСПЯРЧУК.**



Помнік на магіле героя ў г.п. Жалудок

---

**На скрыжаваннях лёсу**

# ЖУРАЎЛІ

**У высокім небе паволі плывуць светлашэрыя воблакі. З густых лясных абшараў слабы ветрык даносіць пах прэлай лістоты. З недалёкай ажыўленай шашы, па якой днём і ноччу імкліва, з шумам нясуцца машыны, раптам чуецца трывожны сігнал сірэны. Куды спяшаецца вадзіцель? Да хворага ці на пажар, ці гэта проста патрабаванне ўступіць дарогу міліцэйскага патруля, які суправаджае калону?**

І раптам мой слых улаўлівае вельмі знаёмае.

– Курл-курл-курлы!

Гэты поўны журботы і смутку жураўліны крык памятаю з дзяцінства. Але я ведаю, што думкі і пачуцці аб птушках, якіх зблізку ніколі не бачыў, цяпер зусім іншыя, чым у дзяцінстве.

Тут, на дачным участку, курлыканне журавоў я чую як вясной, так і восенню. Вясною, калі птахі вяртаюцца з выраю, пачуўшы іх, гляджу на неба, каб адшукаць такі знаёмы трапяткі жывы клін – тыя чорныя ніткі чарады на фоне светлых купчастых аблокаў. А восенню курлыканне нясецца адтуль, з-за амаль цалкам пакінутых шматлікіх дачных участкаў, парослых бадыллём, з-за лесу, за якім, я ведаю, раскінулася ці то лугавіна, ці балота, дзе збіраюцца асцярожныя пералётныя птахі перад далёкім шляхам да цёплых краін.

І кожны раз, як вясной, так і восенню, пачуўшы трывожныя гукі журавоў, мне ўспамінаецца песня на словы Расула Гамзатава. «Мне кажется порою, что солдаты...»

Бацька мой таксама быў салдатам, таксама не вярнуўся з вайны. Калі ў апошні раз пакідаў вясковую хату, мне было ўсяго паўтара гадка...

– Курл-курл-курлы! – чую адтуль, з-за лесу.

Брат таксама быў салдатам. Маёрам-танкістам. Загінуў у Сірыі, на Галанскіх вышынях, выконваючы інтэрнацыянальны доўг. Згарэў у танку. І цяпер, ужо два гады працягваецца там вайна. Гараць будынкі, гінуць людзі, плачуць дзеці і жанчыны, колькасць бежанцаў пераваліла за мільён. Ці захаваўся помнік на могілках загінуўшых герояў у прыгарадзе Дамаска Нажга, на якім прозвішча і гады жыцця камбата беларуса на рускай і арабскай мовах?

– Курл-курл-курлы! – нясецца з лесу, і ў каторы раз на ўспамін прыходзіць тая вясна, калі сын Жэнька, дванаццацігадовы падлетак, з сябрамі пайшоў у лес, вярнуўся з трохлітровым слоікам бярозавага соку і пахваліўся, што бачыў, як ляцелі з выраю жураўлі.

Сын, гуляючы з аднакласнікамі ў школьным двары ў Каменцы, у той год упаў у выкапанае для паказных вучэнняў па грамадзянскай абароне ўкрыццё, прыйшоў дамоў, страціў прытомнасць. Хуткая дапамога завезла яго ў раённую бальніцу, урачы зрабілі трэпанацыю чэрапа, аднак падлетак да свядомасці так і не прыйшоў. Праз суткі адключылі апарат штучнага дыхання…

Бацьку было сорак пяць год, брату – трыццаць пяць, сыну – толькі дванаццаць. Чаму такі нелітасцівы лёс?

Чаму, чаму, чаму?!

**Іван ПЯШКО.**

Дзенніца 2019
№63 [illegible]

**ЮБІЛЯРЫ**

# Калі на лёсе – метка вайны…



**У верасні адзначыць 75-годдзе з дня ўтварэння наша Гродзеншчына. Юбілеі з такімі ж дзвюма лічбамі сёлета святкуюць і яе жыхары. У прыватнасці, акурат сёння – Аляксандр Пятровіч Галаваты з вёскі Зара Камунізму, што побач з Жалудком. Гэта чалавек асаблівага лёсу, на якім сваю метку паставіла вайна.**

Жнівень 1944 года. Праз Беларусь пайшло на захад вызваленне, а тым часам у канцлагеры Асвенцым нараджала жанчына. Хлопчык з'явіўся на свет кволым: занадта многа нягод вынесла яго яшчэ зусім маладая матуля…

– Усё, што я вам сёння раскажу, калі падрос, пачуў ад мамы Надзеі Нічыпараўны, – распачынае аповед Аляксандр Пятровіч. – Падчас вайны многія жыхары нашай вёскі Высокае, што ў Пінскім раёне, пайшлі ў партызаны. У радах народных мсціўцаў быў і мой тата. А бабуля пякла для іх хлеб. Солтыс з мясцовых далажыў пра гэта фашыстам. І аднойчы эсэсаўцы ўварваліся ў дом, дзе жылі родныя. Бабулю расстралялі на парозе, накіравалі ствол і на яе цяжарную дачку – маю 19-гадовую маму… Выратаваў цуд. "Яна нам спатрэбіцца ў Германіі", – вырашыў адзін з немцаў.

Хутка разам з вяскоўцамі цяжарная Надзя аказалася ў вялікім таварняку, які вёз рабочую сілу на чужыну. У вагоны заганялі прыкладам ці з дапамогай аўчарак. Па дарозе састаў не раз трапіў пад бамбёжку, і многія не даехалі… На плацы ў Асвенцыме жывы тавар пералічылі і загналі ў баракі. "Там я і нарадзіўся 10 жніўня 1944-га, – уздыхае Аляксандр Пятровіч, і на яго вочы набягае сляза. – А застаўся жыць, бо немец-баўэр, які з ліку вязняў выбіраў работнікаў для сваёй гаспадаркі, указаў пальцам і на маю маці. Разам з дзвюма зямлячкамі яна даіла кароў, недасыпала і недаядала. І толькі з набліжэннем Чырвонай Арміі іх прыгнятальнікі раптам падабрэлі: налівалі кубак малака і для мяне малога. Дарэчы, тых, хто не патрапіў з-за калючкі ў працоўнае рабства, чакала смерць у печах Асвенцыма…

У 1945-ым Надзея з малым сынам на руках вярнулася ў родную вёску. На папялішча. Жылі ў зямлянцы. Бацька Аляксандра, Пётр Максімавіч Галаваты, прыйшоў з вай-

акрамя Сашы, было яшчэ шасцёра. "А я ж толькі ў чатыры гады пайшоў нагамі, – зноў хмурнее Аляксандр Пятровіч. – Мама ўсё дзівілася, як я і так выжыў…".

Цяжка было і пасля вайны, але бацькі пабудавалі дом і зажылі пад мірным небам. Аляксандра прызвалі на

цовую дзяўчыну, ажаніўся і павёз яе на малую радзіму. Потым вывучыўся на экскаватаршчыка, працаваў у будаўніча-мантажным упраўленні ў Пінску. У сям'і нарадзіўся Сашка-малодшы. Аднойчы на вочы патрапіла аб'ява аб перасяленні ахвотных на Далёкі Усход. Бацька, даведаўшыся пра планы сына, параіў паехаць у Хабараўскі край, дзе тады жыла яго сястра. Так і зрабілі. На новым месцы Аляксандр скончыў курсы памочніка капітана і вадзіў катары па Хоры – прытоку Амура. Але нечакана прыйшла бяда – загінула жонка. Давялося з сынам вяртацца на бацькаўшчыну. Калі ж у 1978 годзе мужчына прывёз малога на Шчучыншчыну – паказаць дзядулю і бабулі па мацярынскай лініі, добрыя людзі пазнаёмілі яго з маладой удавой. Так і сышліся гэтыя двое. Разам Аляксандр Пятровіч і Алена Станіславаўна вось ужо 41 год. Пажываюць і дабро нажываюць. У свой час купілі прасторны дом, выгадавалі дастойнымі людзьмі сына Сашу і дачку Наташу. Цяпер дзеці і ўнукі – жаданыя госці ў бацькоўскім доме.

Жывуць Галаватыя дружна і годна. Аляксандр Пятровіч – нястомны працаўнік, хваліць мужа Алена Станіславаўна. 25 год добрасумленна адпрацаваў зваршчыкам у мясцовай сельгасгаспадарцы. І нават пайшоўшы на пенсію, яшчэ 8 год заставаўся ў рабочым страі. Але гады бяруць сваё, таму і занятак цяпер па сілах – сядзіба, козы ды птаства. А яшчэ муж і жонка заўжды рады добрым людзям, якія заходзяць у хату. Вось і нядаўна прымалі дэлегацыю на чале з работнікам ваенкамата, які ўручыў Аляксандру Пятровічу як малалетняму вязню канцлагера юбілейны медаль "75 год вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў", а таксама пасланцаў ад адміністрацыі "Жалудоцкага агракомплексу" з прадуктовай пасылкай. Не забывае дарогу ў дом Галаватых і старшыня мясцовага сельвыканкама Генадзь Іванавіч Цывінскі.

Трэба думаць, ад многіх родных і знаёмых прыме сёння юбіляр пажаданні даўгалецця і дабрабыту. Далучаемся да іх і мы.

качества, не уронить честь Щучинского     После окончания одного из     Фото автора.

**2022 – ГОД ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ**

# “Я з’явіўся на свет у канцлагеры, а **жыву ў свабоднай Беларусі**”

**У вёсачку з нязвыклай для сённяшняга часу назвай Зара Камунізму, што знаходзіцца ў Жалудоцкім сельсавеце, мы завіталі з загадчыцай аддзялення сацыяльнай дапамогі на даму ТЦСАН Ірынай Даніленіч. Яна ўжо ведала гісторыю няпростага жыцця Аляксандра Галаватага – у мінулым малалетняга вязня фашысцкага канцлагера, і параіла абавязкова пазнаёміцца з гэтым моцным духам чалавекам.**

Ваеннае ліхалецце ён перажыў у несвядомым узросце – быў тады зусім немаўляткам, але з расказаў маці ведае пра ўсе нечалавечыя выпрабаванні, якія выпалі на долю іх сям’і. Уцалелы ў пекле нямецкага рабства, Аляксандр Пятровіч удзячны лёсу за кожны новы дзень, таму што з малых гадоў засвоіў: галоўная каштоўнасць на свеце – гэта само жыццё.

– Калі пачалася вайна, наша сям’я жыла на Піншчыне, – распавёў 78-гадовы мужчына. – Як не раз казала мама, акупантаў у нашым сяле Высокае ўсе ненавідзелі, многія, як маглі, дапамагалі партызанам. Да прыкладу, наша бабуля пякла для народных мсціўцаў хлеб. Гэта нейкім чынам стала вядома паліцаям. Аднойчы яны ўварваліся ў наш дом, расстралялі бабулю, падпалілі хату. Маму, штурхаючы прыкладам ружжа ў плечы, павялі туды, дзе збіралі маладых людзей з усяе акругі, каб адправіць у Германію. А мама тады пад сэрцам насіла мяне. Ледзь вынесла яна доўгую дарогу ў душным вагоне-таварняку, куды біткам набілі людзей, ахоўвалі, каб не збеглі, з аўчаркамі. Цудам выжыўшы, мама нарадзіла мяне ў канцлагеры.

Выратаваннем стала тое, што аднойчы прыехаў чарговы бауэр па дармовую рабочую сілу. Адбіраў моцных і дужых, але, відаць, нешта чалавечае прачнулася і ў ім, калі ўбачыў змучаную маладую жанчыну з дзіцём на руках. Затым была да знямогі цяжкая праца на ферме гэтага гаспадара, але толькі дзякуючы таму, што ўдалося выйсці з варотаў канцлагера, мы з мамай выжылі. З нямецкага рабства нас вызвалілі чырвонаармейцы ў пераможным 1945-м.



Вярнуліся ў родную вёску, жылі ў зямлянцы. Тата з вайны прыйшоў без нагі, прыстасаваў сабе замест пратэзу дзеравяшку. Ён, аказваецца, таксама быў у нямецкім канцлагеры: цяжка параненым трапіў у палон. У мірным жыцці, думаеце, чакаў нейкіх ільгот з-за сваёй інваліднасці? Не! Ён пайшоў зарабляць рубель для сям’і… у кузню і 40 год прапрацаваў кавалём! Мяне таксама многаму навучыў.

Аляксандр Галаваты праходзіў армейскую службу ў нашых мясцінах: ахоўваў звышсакрэтныя аб’екты ў Багданаўцах. Потым быў пераведзены ў адну з воінскіх часцей горада Гродна. Працаваў, набываў прафесію ў рачным вучылішчы і неўзабаве рвануў у Хабараўскі край, дзе па рацэ Амур хадзіў на катары ў статусе капітана другога рангу.

Ужо даўно і надзейна сям’я Галаватых прапісалася на Жалудоччыне. Купілі дом у вёсцы Зара Камунізму, пусцілі тут карані. Аляксандр Пятровіч больш за чвэрць стагоддзя прапрацаваў у мясцовым калгасе газаэлектразваршчыкам. Выдатны спецыяліст, ён ніколі не адмаўляў аднавяскоўцам у просьбах выручыць па гаспадарчых справах. Жонка Алена Станіславаўна знайшла сваё прызванне ў якасці повара – працавала ў сталовай для работнікаў жывёлагадоўчага комплексу. Абодва з супружнай пары ўжо на пенсіі. Удзячны лёсу, што маюць добрых дзяцей. Сын Аляксандр жыве ў Лідзе, працуе на вытворчасці. Малодшая дачка Наталля – медсястра ў адной з гродзенскіх клінік. Часта наведваецца ў дом да пажылых людзей малодшая сястра міласэрнасці службы Чырвонага Крыжа Лілія Русюкевіч. Заўжды цікавяцца жыццём былога вязня канцлагера прадстаўнікі сацыяльнай службы.

– Купіць лякарствы ў аптэцы, прадукты, пракантраляваць бяспеку бытавых умоў – усё гэта для мяне звычайныя абавязкі, да якіх я адношуся з душой. Тым больш, што разумею, колькі ўсяго перажыта людзьмі, якіх мы вобразна называем дзецьмі вайны, – разважае Лілія Васільеўна. – А вось хадзіць у бібліятэку і выбіраць кнігі мой падапечны любіць сам. Гэта для яго сапраўдны рытуал! Хоць я і перасцерагаю іншы раз, каб так шмат не чытаў, а пабярог зрок.

– Якое ж жыццё без кнігі? – парыруе Аляксандр Пятровіч і паказвае нам навінкі літаратуры, якімі зачытваецца гэтымі доўгімі восеньскімі вечарамі. – Пра вайну і нашу армію люблю чытаць, пра адвагу і подзвіг савецкага народа. Не было б Вялікай Перамогі над фашызмам – не было б і нас з вамі. Ганаруся, што жыву ў мірнай і свабоднай Беларусі, на сабе адчуваю клопат дзяржавы, павагу з боку мясцовай улады. Гэта так важна для нас – людзей старэйшага пакалення.

**Таццяна СТУПАКЕВІЧ. Фота аўтара.**

Дзянніца. - 2021 - №16. - 02 сак. - С. 6

Татьяна СТУПАКЕВИЧ.

# “Незабудка” не даст забыть о прекрасном

**В Желудокской горпоселковой библиотеке плодотворно работает любительское объединение “Незабудка”. На его занятия собираются представители самого разного возраста, разных профессий. Этих людей объединяют общие интересы к цветоводству, садоводству и огородничеству.**



Здесь можно получить полезные советы по возделыванию культур, пообщаться и обменяться опытом. Всегда полезны встречи со специалистами и интересными, увлеченными людьми. Совершая весной и летом экскурсии на лучшие садовые участки, можно научиться ландшафтному дизайну и оформлению клумб, грамотному выращиванию цветов и овощных культур.

Так как в городском поселке Желудок ежегодно проводится такой замечательный брендовый праздник, как “Фестиваль цветов”, то многие наши жители стремятся, чтобы их усадьбы соответствовали статусу “цветочной столицы региона”. “Незабудка” в этом очень помогает.

С ранней весны и до поздней осени невероятную красоту можно увидеть на садовом участке у цветовода-любителя с многолетним стажем Александры Серко. Каких только цветов у нее нет?! О выращивании любого растения она может говорить часами, готова ответить на любой вопрос своих единомышленников. Дает компетентные советы по посадке и уходу за культурами, выборе лучших сортов, подскажет, как и чем обработать растения от разных вредителей и сорняков.

Охотно делится своими цветочными достижениями и передает опыт Галина Слапик. От её дома в пеларгониях и приусадебного цветочного участка летом не отвести взгляд! Люция Цибрук может похвастаться прекрасными розами и раскрыть секрет их успешного выращивания.

А вот Валентина Ярмантович – начинающий цветовод, поэтому всегда с огромным интересом впитывает новые знания.

Руководителем любительского объединения “Незабудка” является заведующая библиотекой Наталья Семенюк. Она продемонстрировала слайды и фотографии лучших цветочных участков и усадеб, познакомила с дальнейшими планами и мероприятиями. Кстати, в библиотеке действует и любительское объединение “Формула здоровья”, руководит которым библиотекарь Светлана Иода. Благодаря работникам культуры досуг наших желудчан организован с пользой.

**Мария РУДАЯ,**
**жительница г.п. Желудок. Фото автора.**

Дзянніца 2012 24 ліпеня № 59

ЭТНАКАНФЕСІЯНАЛЬНАЯ СТАРОНКА

# Садружнасць




Лекцыю чытае С.А. Піваварчык

■ Супрацоўніцтва

# Гісторыя яўрэйскага народа папоўніцца новымі фактамі

## У нядзелю ў Жалудку пачала працаваць палявая школа, арганізаваная расійскім цэнтрам "Сэфер" і ГрДУ імя Я. Купалы

***19 студэнтаў і чатыры выкладчыкі з Беларусі, Расіі, Украіны і Малдовы на працягу тыдня будуць працаваць у Жалудку. Што прывяло іх на нашу шчучынскую зямлю? Імкненне знайсці як мага больш звестак пра яўрэяў, дасканала вывучыць надпісы на помніках на яўрэйскіх могілках і падрабязна апісаць іх. Такім чынам гісторыя гэтай народнасці папоўніцца новымі фактамі.***

– Палявая школа – выдатная магчымасць для студэнтаў выкарыстаць атрыманыя веды на практыцы, набыць навыкі даследчай дзейнасці, – выступаючы на адкрыцці школы, заўважыў Сяргей Аркадзьевіч Піваварчык, загадчык кафедры археалогіі і этналогіі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта, адзін з арганізатараў праекта. – Шчыра прызнацца, я вельмі рады, што з усяго прапанаванага спісу населеных пунктаў аднадушна быў выбраны Жалудок. Магчыма, гэта нават паспрыяе развіццю міжнароднага турызму, і пасёлак стане яшчэ больш вядомы за межамі нашай краіны.

– "Сэфер" (што ў перакладзе зна-



На яўрэйскіх могілках

гэта школа адкрыла сезон палявых школ цэнтра "Сэфер": літаральна праз тыдзень пачне працаваць палявая школа ў Латвіі, а затым і ў Малдове.

– Траліць у такое месца, дзе цесна пераплятаюцца самыя розныя культуры – праваслаўная, каталіцкая, іудзей-

расказала аб далейшых планах і перспектывах развіцця пасёлка.

Праект, які рэалізуецца гэтымі днямі ў Жалудку, не толькі навукова-даследчы, але і адукацыйны. Удзел у яго рэалізацыі намераны прыняць і

даследчыкаў у яўрэйскім універсітэце ў Іерусаліме, прапануем паслугі лектарскага бюро. Адзін з нашых пастаянных акадэмічных партнёраў – Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт.

У першы дзень работы палявой школы яе ўдзельнікі пазнаёміліся з гісторыяй пасёлка, праслухалі некалькі лекцый і пабывалі на канцэрце мінскага спевака Аляксея Жбанава, які хоць і не з'яўляецца носьбітам яўрэйскай культуры, але глыбока яе ведае і паважае. Як прызнаўся Аляксей у час інтэрв'ю, яўрэйскія песні яго кранулі з самага дзяцінства, уражвалі сваім непадабенствам на іншыя.

– Я разумею ідыш, таму што добра валодаю нямецкай мовай, – расказвае Аляксей. – Нямецкая лексіка і складае аснову ідыш, у якой, дарэчы, шмат і беларускіх слоў. Я выконваю песні на свае вершы, на вершы беларускіх класікаў, у маім рэпертуары ёсць творы студэнцкага фальклору. Яшчэ адзін з накірункаў – песні на ідыш і ў перакладзе на беларускую мову.

## З першых вуснаў



**Алена СМІРНОВА, гамяльчанка, навучэнка магістратуры каталіцкага ўнверсітэта г. Лёвен у Бельгіі:**

– Я закончыла Еўрапейскі гуманітарны ўніверсітэт у Вільнюсе. Першы раз прымала ўдзел у рабоце палявой школы ў 2009 годзе ў Маскве. Мяне вельмі цікавіць гісторыя Беларусі, гісторыя яўрэяў. Мне заўсёды прыемна гутарыць са сталымі людзьмі, яны так многа ведаюць, а кожны іх расказ – проста скарбонка інфармацыі. Вельмі спадзяюся і ў Жалудку натрапіць на цікавых суразмоўцаў.



**Маргарыта КАЖАНЕЎСКАЯ, Віцебская вобласць:**

– Я займаюся ў магістратуры Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэ-

– "Сэфер" (што ў перакладзе значыць "кніга") – гэта цэнтр, які каардынуе дзейнасць акадэмічных структур і самастойных даследаванняў у галіне іудайкі (усё, што звязана з яўрэйскай тэматыкай) ва ўсіх краінах СНД і Балтыі,



Спявае Аляксей Жбанаў

– патлумачыла памочнік каардынатара адукацыйных праграм цэнтра Ірына Уладзіміраўна Капчонава. – У Жалудку будуць працаваць адразу дзве групы: этнографы і эпіграфісты. Задача этнографаў – сустракацца з насельніцтвам і запісваць успаміны людзей, а эпіграфісты будуць вывучаць надпісы на помніках. Дарэчы,

ры – праваслаўная, каталіцкая, іудзейская – мы марылі даўно, – прызнаецца Вольга Уладзіславаўна Бялова, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела этналінгвістыкі і фальклору Інстытута славяназнаўства Расійскай акадэміі навук. – Яшчэ восем год таму, калі мы праязджалі па гэтых мясцінах, зразумелі, што ў кожнага куточка тут свая гісторыя, пра якую нам вельмі хацелася даведацца. Таму сёлета мы абсалютна ўсвядомлена выбралі Жалудок месцам для размяшчэння школы.

Цёпла віталі гасцей пасёлка старшыня Жалудоцкага пасвыканкама Генадзій Іванавіч Цывінскі і кіраўнік адзінага на тэрыторыі Гродзенскай вобласці цэнтра ўстойлівага развіцця Таіса Уладзіміраўна Трукшына. Генадзій Іванавіч расказаў удзельнікам сустрэчы аб тым, што ў пасёлку ўдалося захаваць многія старажытныя будынкі. Нават за некалькі дзён, якія правядуць госці ў Жалудку, можна адчуць унікальнасць тутэйшай зямлі. А Таіса Уладзіміраўна пазнаёміла прысутных з праектамі, у якіх прымалі ўдзел жалудчане, і

рэалізацыі намераны прыняць і школьнікі Жалудоцкай школы. Дырэктар Уладзімір Анатольевіч Васількевіч сам гісторык, і, безумоўна, яго зацікавіла работа палявой школы.

За гады дзейнасці цэнтра "Сэфер", а арганізаваны ён быў у 1994 годзе, яго ўдзельнікі сабралі багаты матэрыял.

– Мы выязджаем ў рэгіёны, звязаныя з іудайкай, – расказвае Ірына Уладзіміраўна Капчонава. – Большасць удзельнікаў – гэта моладзь, аднак часта да нас далучаюцца і людзі, якія ўжо сказалі сваё важкае слова ў навуцы. І ў гэтай школе некалькі кандыдатаў навук. Іудайка – даволі малады накірунак дзейнасці. Акрамя палявых школ мы праводзім канферэнцыі, арганізуем стажыроўку для маладых

рускую мову.

– Работа палявой школы вельмі важная для нашага пасёлка, – упэўнены Генадзій Іванавіч Цывінскі, паказваючы нам яўрэйскія могілкі, на якіх будуць весціся работы. – Напэўна, пасля праведзеных даследаванняў стануць вядомыя новыя факты з гісторыі Жалудка. Гісторыя яўрэйскага народа, яго захаванні – гэта і наша гісторыя. І справа гонару – даглядаць належным чынам такія мясціны. Дарэчы, асаблівыя словы падзякі хачу выказаць работнікам камунгаса і "Жалудоцкага агракомплексу", якія ўдзельнічалі ў добраўпарадкаванні могілак.

**Ганна РУДСКАЯ.**
**Фота Андрэя ЦЕСЛЮКА.**



**Адкрыццё палявой школы ў Жалудоцкім пассавеце**

[redacted] жаўнага ўніверсітэта, пішу дыплом па гісторыі яўрэяў. У падобнай экспедыцыі прымаю ўдзел другі раз. Я нарадзілася ў каталіцкай сям'і, аднак з цікавасцю вывучаю гісторыю яўрэйскага народа. А расла ў такім жа мястэчку, як Жалудок, таму мне як мага больш хочацца ведаць пра такія ж населеныя пункты. Думаю, што абсалютна ўсё, што давядзецца мне тут пачуць і знайсці, будзе вельмі дарэчы ў маёй даследчай дзейнасці.



**Міхаіл ВАСІЛЬЕЎ, аспірант інстытута краін Азіі і Афрыкі МДУ імя Ламаносава:**

– Удзел у мерапрыемствах цэнтра "Сэфер" я прымаю ўжо некалькі год запар. Працаваў у палявых школах на тэрыторыі Малдовы, ва Украіне, у Расіі... Іудайка – галіна, якою я займаюся прафесійна. Працаваць у новым калектыве заўсёды цікава. Хочацца знайсці раней невядомы матэрыял, апрацаваць яго, для сябе адкрыць нешта новае... Упэўнены, каларытны Жалудок нікога з нас не расчаруе.